# КРОК ЗА КРОКАМ

## ЗНАЁМСТВА ДЗЯЦЕЙ З НОТНАЙ ГРАМАТАЙ

У педагагічнай літаратуры паняцце "дзіцячая музычная творчасць" трактуецца па-рознаму. У адных выпадках — як развіццё творчых здольнасцей вучняў у спевах і ігры на музычных інструментах, у другіх — як фарміраванне цэласнай і непаўторнай асобы ў працэсе знаёмства з музыкай.

Думаецца, не варта ўпадаць у крайнасць, рашаючы дылему, што важнейшае і чым больш неабходна займацца на ўроках музыкі — навучаннем ці выхаваннем. Лепш знайсці меру і ў роўнай ступені прафесійна рабіць і тое, і другое. Між тым зараз пытанні, што датычаць навучання школьнікаў музыцы, адсоўваюцца на другі план, разглядаюцца як неабавязковыя. Наўрад ці можна пагадзіцца з гэтым. Зусім ненармальнай з'явай, напрыклад, трэба лічыць тое, што большасць выпускнікоў нашых школ не ведаюць нотнай граматы, затарможаны ў слыхавым развіцці. І гэта тым больш недаравальна, што асобныя метады навучання музыцы былі ніядрэнна распрацаваны ў так званай "старой школьнай педагогіцы".

У гэтым артыкуле робіцца спроба ўзнавіць і дапоўніць адзін з добра вядомых і, на жаль, незаслужана забытых метадаў знаёмства дзяцей з элементамі нотнай граматы (Ж. Жак-Далькроз, К. Орф, З. Кодай, Э. Сёні, З. Жофчак, В. Каваліў і інш.).

Работу мэтазгодна весці ў форме падрыхтоўкі рытмічнай партытуры. У метрарытмічным плане музычны матэрыял павінен будавацца на выкарыстанні толькі чацвяртных і восьмых працягласцей у размеры дзве чвэрці.

На першым этапе выхоўваецца адчуванне раўнамернай рытмічнай пульсацыі. Дзеці вучацца адзначаць пульс розных па характару музычных твораў з дапамогай воплескаў, паваротаў корпуса, скачкоў і г. д. Можна прапанаваць вучням адзначаць пульс пачутай музыкі дома, прыдумваць новыя рухі.

У гутарцы падкрэсліваем: усё, што рухаецца, мае свой пульс. Раўнамерна стукае гадзіннік, хістаецца маятнік, змяняюцца поры года і час сутак. Калі мы спакойныя, і ў нас пульс б'ецца раўнамерна. Кладзём руку на запясце і прыслухоўваемся да яго.

— А цяпер паслухаем музыку. Ці мае пульс яна?

Гучыць грамзапіс полькі, дзеці разам з настаўнікам адзначаюць пульс воплескамі. На наступным уроку мяняюцца музычныя творы, апрабуюцца новыя спосабы паказу пульсу.

Найбольш распаўсюджаны ў практыцы прыём воплескаў. У методыцы Карла Орфа яны называюцца прыроднымі музычнымі інструментамі. Сярод іх — пляканне па цэнтры ці па тыльным боку далоні, па запясці, па пальцах. Можна ўжываць удары жменяй, пстрыканне пальцамі, шчоўканне языком, рухі ног, корпуса, галавы і інш. Засваенню раўнамернай рытмічнай пульсацыі неабходна ўдзяляць увагу даволі доўгі час і дабівацца таго, каб кожны вучань у класе мог свабодна адзначаць яе ў розных па характару музычных творах.

Наступным крокам методыкі з'яўляецца запіс пульсу на дошцы і ў сшытку. Пад гучанне музыкі настаўнік паказвае, як гэта робіцца, запісваючы на дошцы вертыкальныя палачкі:

| | | | | | | |

Затым іх запісваюць дзеці. Неабходна дабівацца таго, каб палачкі атрымліваліся роўнымі, без нахілу, не ляпіліся адна да адной. Гэта ж прававобразы нот, і навыкі запісу прыдадуцца ў далейшым. Прапануем дзецям і дома запісваць пульс музыкі, якую яны будуць слухаць на працягу тыдня. Затым на даволі працяглы час у якасці асноўнага музычнага матэрыялу для работы бярэцца мелодыя знаёмай песні ці папеўкі, якая адпавядае метрарытмічным патрабаванням, указаным вышэй. Пульс яе запісваем на дошцы. Запіс робіцца ўверсе і на кожным уроку ўзнаўляецца. Дзеці запісваюць яго ў сшытку таксама ўверсе. Тлумачым, што кожная палачка будзе зараз абазначацца складам "та". Адзначаем воплескамі і адначасова вымаўляем склады, а затым словы беларускай народнай песні "Сеў жучок на сучок":

| | | | | | | |
та та та та та та та та

Замацоўваецца гэта з дапамогай спецыяльнага практыкавання "Крок". Двума пальчыкамі дзеці імітуюць на далоні крок і адначасова вымаўляюць уголас словы:

| | | |
Іс - ці, Іс - ці

На наступных занятках вучымся адчуваць і адзначаць рытмічны малюнак мелодыі песні, запісваць яго на дошцы графічна і з дапамогай рытмічных складоў. Рытм запісваецца пад запісам пульсу (мал. 1).

Рытмічныя склады "ці-ці" замацоўваюцца з дапамогай практыкавання "Бег":

П П
бег-чы, бег-чы

Супастаўленне рытму і пульсу дазваляе параў-




*Мал. 1*

наць іх, прааналізаваць, адчуць розніцу ў воплесках і вымаўленні. Адзначаць іх можна ў форме "двухгалосага" практыкавання. Напрыклад, наском нагі пульс, а крокамі пальцаў па далоні рытм. Ці адзін вучань пульс, а другі рытм (мал. 2).




*Мал. 2*

Затым у дзяцей выпрацоўваем адчуванне моцнай долі. Тэкст песні вымаўляецца ўголас, моцная доля адзначаецца воплескамі:

*Се́ў жучок на́ сучок,*
*На́ скрыпачцы гра́е.*

Звяртаем увагу вучняў на тое, што моцная доля надае музыцы стройнасць і выразнасць. Паказваем гэта і адзначаем моцную долю ў запісе рысачкай (мал. 3).




*Мал. 3*

Затым знаёмім дзяцей з паняццямі "такт" і "тактавая рыса". Паведамляем ім, што перад кожнай моцнай доляй у музыцы прынята ставіць рысу. Яе называюць тактавай, а адлегласць паміж дзвюма тактавымі рысамі — тактам. Разам з дзецьмі праводзім тактавыя рысы ў запісе, падлічваем колькасць тактаў (мал. 4).




*Мал. 4*

Калі гэту работу весці метадычна і мэтанакіравана, то да такога запісу можна падвесці дзяцей прыкладна да лютага, г. зн. да сярэдзіны трэцяй чвэрці. Аналізуючы запіс, звяртаем увагу дзяцей на тое, што ў кожным з тактаў можна знайсці па два ўдары пульсу. А гэта значыць, што ў музыцы маецца памер і яго звычайна абазначаюць лічбай (у дадзеным выпадку лічбай 2). Зараз запіс набывае такі выгляд:




Абазначэнне памеру з дапамогай лічбы робіць яго засваенне больш даступным, чым традыцыйнае — дробам. Малодшыя школьнікі яшчэ не знаёмыя з дробамі, для іх гэта вельмі абстрактнае паняцце. Лічым цяпер на "раз-два", паказваем схему дырыжыравання на дзве чвэрці. Пытаемся:

— А што, калі б у кожным такце было па тры ўдары пульсу? Якім быў бы памер?

— Зразумела, тры, — адказваюць дзеці.

— І лічыць будзем да трох. А калі чатыры, то да чатырох.

Такі падыход дазваляе даволі лёгка засвоіць вельмі складанае тэарэтычнае паняцце.

Паказваем дзецям маленькі барабанчык і прапануем прыдумаць для яго рытмічную тэму. Разважаем разам, як лепей яна прагучала б. Прапануем на выбар тры варыянты выканання. У першым удары робяцца на першую і другую долі:



У другім — на "раз" удар, на "два" маўчанне:



а ў трэцім наадварот — на "раз" маўчанне, на "два" ўдар:  З якім суправаджэннем песня будзе лепш гучаць?

Прыходзім да высновы, што другі варыянт (калі на "раз" барабан гучыць, а на "два" маўчыць) падыходзіць больш за астатнія. Застаецца толькі зафіксаваць гэта ў запісе. Дзеці пакуль што ведаюць, як запісаць першую долю, але не ведаюць, як у музыцы абазначаецца маўчанне. Вось тут яны і знаёмяцца з чарговым тэарэтычным паняццем — паўзай. Яна абазначаецца ў запісе знакам Z (эквівалент чацвяртной паўзы ў музыцы). Метадысты ўводзяць яго дзеля зручнасці і аператыўнасці запісу. Да яе сапраўднай натацыі пераходзім значна пазней. У выніку запіс рытмічнай партытуры выглядае цяпер так (мал. 5):




*Мал. 5*

Партыю барабана даручаем выканаць камусьці

з дзяцей. Настаўнік іграе акампанемент, дзеці напяваюць мелодыю. Звяртаем увагу на тое, як трэба іграць на барабане, на гордую паставу, урачыстыя ўзмахі рук, разгорнутыя плечы, прыўзнятую галаву. Для вучня выкананне такога задання павінна стаць падзеяй і надоўга запомніцца. Бо гэта ж урок эстэтычнага выхавання, а не проста механічнае завучванне няхітрага рытмічнага задання.

На наступных занятках ствараем партыю другога музычнага інструмента — пандэйры (можа быць заменена бразготкай). Праца зноў вядзецца па ўзору, але цяпер ужо з выкарыстаннем чацвяртной паўзы. У дадзеным выпадку такімі ўзорамі могуць паслужыць наступныя варыянты выканання:



Тлумачым, як трэба іграць на пандэйры, як яе трэба трымаць, каб лепш гучала. Спрабуем выканаць усе ўзоры і прыходзім да высновы, што лепшым будзе трэці: 2|z П|.
Запісваем яго ў партытуру (мал. 6).




*Мал. 6*

Выконваем мелодыю ў суправаджэнні пандэйры і барабана. Дзеці могуць адзначаць таксама пульс і рытмічны малюнак мелодыі. Пры гэтым адначасова з воплескамі рэкамендуецца вымаўляць рытмічныя склады. Як адзначаюць фізіёлагі, засваенне рытму адбываецца значна эфектыўней, калі адначасова выкарыстоўваюцца рухальныя і моўныя аналізатары.

Потым ствараем партыю бубна. Настаўнік паказвае толькі адзін варыянт выканання:

2|𝄾♪𝄾♪|.

Дзеці ацэньваюць яго гучанне. Аднак, для таго каб зрабіць запіс у партытуры, неабходна пазнаёміць іх з новымі нотнымі абазначэннямі — восьмай паўзай і асобнай нотай ♪ (ці). З гэтага моманту пераходзім да агульнапрынятага запісу з аваламі і сцяжкамі. Выконваючы мелодыю два разы запар, знаёмім школьнікаў з паняццем аб рэпрызе і яе абазначэннем 𝄆 𝄇 (мал. 7).

Ствараем партыю для трохвугольніка, паказваем, як на ім трэба іграць. Пасля лёгкага ўдару рука з інструментам уздымаецца крыху ўверх і ўбок. У такім выпадку гучанне атрымліваецца напеўным і прыгожым. Нагадваем дзецям, што характар выканання песні патрабуе мяккага і ціхага гучання трохвугольніка. Прапануем ім вызначыць толькі адно




*Мал. 7*

месца, у якім будзе гучаць трохвугольнік. Шляхам адбору і аналізу адказаў школьнікаў прыходзім да высновы, што лепш за ўсё ён будзе гучаць у апошнім такце песні. Выконваем яе, а затым запісваем на дошцы, знаёмячы дзяцей з новым абазначэннем 𝅗𝅥 (таа) (мал. 8).




*Мал. 8*

Такім чынам, за кароткі адрэзак часу без асаблівага ўрону для цэласнасці ўрока можна пазнаёміць дзяцей з ключавымі паняццямі нотнай граматы. Гэта пульс (метр), рытм, моцная доля, такт, тактавая рыса, размер, чацвяртная, восьмая і палавінная ноты, паўза, рэпрыза.

Дзеці знаёмяцца з нотамі па меры неабходнасці выкарыстання іх у працэсе музіцыравання. І няхай пакуль што ім не паведамляюцца сапраўдныя назвы нот, а толькі іх складовыя абазначэнні, слыхавыя навыкі засваення элементаў музычнай граматы робяцца больш важным фактарам, чым простае завучванне нот, без магчымасці выкарыстаць іх калі-небудзь на практыцы. Яны дазваляюць школьнікам актыўна ўключацца ў працэс музіцыравання, асэнсоўваць значэнне нотнай граматы, выклікаюць цікавасць да музыкі. І гэта можа атрымаць лагічнае развіццё ў далейшай працы.

Асабліва эфектыўным аказваецца выкарыстанне на ўроку металафонаў. Навучанне выкананню на іх вядзецца ўжо з выкарыстаннем нотнага запісу і ведаў, атрыманых раней. Найбольш зручнымі для работы з'яўляюцца металафоны орфаўскага аркестра. У свой час яны прадаваліся ў магазінах наглядных дапаможнікаў. Інструменты ідэальна настроены, у іх прыгожы тэмбравы каларыт. У залежнасці ад малаточкаў з гумавымі ці лямцавымі наканечнікамі яны гучаць прыглушана альбо звонка. Пласцінкі металафонаў здымаюцца. Можна, напрыклад, пакідаць толькі тыя пласцінкі, гукі якіх будуць выкарыстоўвацца пры выкананні, а астатнія здымаць. Калі ж маюцца іншыя металафоны, у якіх пласцінкі замацаваны жорстка, то тыя пласцінкі, на якіх мы будзем іграць, пазначаем паперкамі. На іх запісваем назвы гукаў.

Тлумачым дзецям, як трэба трымаць малаточкі, — вялікім, указальным і сярэднім пальцамі. Малаточак нельга зацiскаць у кулак, класці на ручку ўказальны палец. Гэта псуе гук. Удар павінен быць кароткі і пругкі. Малаточак нельга пакідаць на пласцінцы, каб не прыглушаць гук. Мэтазгодна карыстацца адначасова чатырма інструментамі. Гэта дазваляе падзяліць выкананне мелодыі на чатыры фразы і размеркаваць абавязкі. Кожнаму з вучняў даручаецца выканаць па адной фразе. Партыі металафонаў запісваюць не на нотным стане, а літарнымі абазначэннямі пад адпаведнымі працягласцямі. Рэкамендуецца ўносіць у партытуру і нотны запіс мелодыі. Хаця дзеці пакуль яшчэ не знаёмыя ні з гукавышыннасцю, ні з нотным станам, такі запіс дае візуальнае ўяўленне аб напрамку мелодыі і пэўным чынам арыентуе вучняў.

Партыі металафонаў развучваюцца не адразу, не на адным уроку, а па адной фразе на кожных занятках. Рытмічны малюнак спачатку адзначаецца воплескамі, прагаворваецца складамі, пралічваецца, выконваецца па жэсту настаўніка. Увесь клас (тыя, хто не ўдзельнічае ў ігры) дырыжыруе разам з педагогам, шэптам прагаворвае рытмічныя склады. Не абысціся тут і без дадатковай індывідуальнай работы. Упэўненая ігра партый першымі выканаўцамі служыць добрым прыкладам для іншых дзяцей, і яны, як правіла, хутка пераймаюць стыль і манеру выканання.

Нарэшце, калі партыі вывучаны, можна злучыць усё разам. Партытура выпісваецца на плакаце. Акрамя таго, яна ў кожнага школьніка зафіксавана ў сшытку. Пачынаецца зводная рэпетыцыя. Паўтараем асобна партыі барабана, пандэйры, металафонаў, трохвугольніка, бубна. Песня выконваецца цалкам, са словамі.

Калі маецца вялікі ксілафон, то настаўнік можа выканаць акампанемент на ім. Левай рукой іграецца партыя баса, правай "вілкападобным" ударам — акорды. Два малаточкі бяруцца ў адну руку, іх канцы ўпіраюцца ў сярэдзіну далоні і ўтрымліваюцца астатнімі пальцамі. Перад ігрой устанаўліваем малаточкі на патрэбную адлегласць. У нашым выпадку — для выканання інтэрвалу тэрцыі. Іграем левай рукой на "раз", правай на "і" (як бас-акорд). Выка-




Мал. 9.

нанне партытуры — вынік карпатлівай працы настаўніка ў класе на працягу ўсяго навучальнага года. Хай сабе за год аркестравана толькі адна песня. Затое колькі ўзнікала сітуацый для развіцця творчых здольнасцей дзяцей, колькі атрымана імі каштоўнай інфармацыі!

У такім жа плане вучні будуць знаёміцца і з іншымі элементамі нотнай граматы, больш складанымі рытмічнымі злучэннямі і групоўкамі, аднак пры ўмове, што яны будуць уводзіцца ў працэсе работы як неабходнасць палепшыць гучанне музыкі, як вынік творчых пошукаў сумесна з настаўнікам, а не як нейкі новы тэарэтычны матэрыял, які трэба запомніць і засвоіць без практычнага прымянення і асэнсавання.

Вопыт сведчыць, што працу над партытурай больш мэтазгодна пачынаць у II класе, для таго каб творчы працэс быў потым прадоўжаны, але ўжо на больш складаным музычным матэрыяле. Зразумела, не трэба разглядаць гэта як самамэту. Пры ўдумлівым планаванні ўрока такая дзейнасць не павінна парушаць тэматызм праграмы па музыцы. Яна можа арганічна ўліцца ў структуру амаль кожных заняткаў і нават дапамагчы адцяніць асобныя дэталі тэматызму, унесці неабходны кантраст. Усё ў выніку залежыць ад майстэрства самога настаўніка, яго ўменне прафесійна арганізаваць творчую дзейнасць дзяцей, накіраваць яе ў патрэбнае рэчышча.

Вось як урэшце будзе выглядаць рытмічная партытура і аркестроўка песні “Сеў жучок на сучок” (мал. 9).

*Сеў жучок на сучок,*
*На скрыпачцы грае,*
*Павучок “Крыжачок”*
*Скача, напявае.*
*Гэй, ты тупні, нага,*
*Новенькія боты!..*
*Добра пець, люба граць*
*Нам пасля работы!*

**В. П. РЭВА,**
**кандыдат педагагічных навук.**

г. Магілёў.